# ПАМЯТАЕМ, ШАНУЕМ, КЛАПОЦІМСЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Адна з галоўных і чаканых мер падтрымкі — выплата штогадовай матэрыяльнай дапамогі, якая рэалізуецца з 2021 года паводле ўказа Прэзідэнта. Сёлета выплата матэрыяльнай дапамогі будзе праходзіць з 25 красавіка да 4 мая. Яе памеры ў параўнанні з мінулым годам павялічыліся. Для ўдзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны матэрыяльная дапамога складзе чатыры тысячы рублёў, для іншых катэгорый ветэранаў — дзве тысячы рублёў; грамадзяне, якія аднесены да асоб, што пацярпелі ад наступстваў вайны, — адна тысяча рублёў. У цэлым на аказанне дапамогі сёлета ў рэспубліканскім бюджэце прадугледжана больш за 10,5 мільёна рублёў, — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА.**

Адна з істотных мер падтрымкі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны рэалізуецца праз пенсіённае забеспячэнне. Сёння сумарны памер штомесячнай выплаты да пенсіі ўдзельнікам і інвалідам вайны ў выглядзе павышэння ўзроставых даплат, надбавак на догляд складае ў сярэднім амаль 600 рублёў, іншым катэгорыям ветэранаў — каля 250 рублёў. У красавіку сярэдняя пенсія па ўзросце ўдзельнікаў і ветэранаў вайны складае больш як 1,2 тысячы рублёў, адносна інвалідаў вайны — больш як 1,35 тысячы рублёў.

Усім ветэранам, якія маюць патрэбу ў дадатковых мерах падтрымкі, у старонняй дапамозе з улікам узросту, аказваюцца розныя формы сацыяльнага абслугоўвання. Тыя ветэраны, якія маюць патрэбу ў пастаянным кругласутачным доглядзе, у тым ліку медыцынскай дапамозе, пражываюць у сацыяльных пансіянатах. Сёння гэта каля 40 чалавек. Сацыяльныя паслугі дома атрымліваюць больш як 330 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 85 ветэранаў атрымліваюць догляд родных у сувязі з патрэбай у пастаяннай старонняй дапамозе. Пры гэтым іх блізкім выплачваецца дапамога.

Штогод у рамках дзяржаўнай праграмы і ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта праводзіцца абследаванне ўмоў пражывання ветэранаў для выяўлення патрэбнасці ў аказанні дадатковых мер падтрымкі. Сёлета першаснае абследаванне завяршылася 20 сакавіка.

— Усіх ветэранаў мы наведалі дома, вывучылі ўмовы іх пражывання і патрэбнасць у аказанні мер падтрымкі. Гэтае пытанне з парадку дня ў нас не здымаецца ніколі. Як паказалі вынікі абследавання, нашы ветэраны жывуць у асноўным у дастаткова камфортных умовах, і сёння нейкія істотныя меры падтрымкі для паляпшэння якасці жыцця не патрабуюцца. Непасрэдна мясцовыя органы ўлады пастаянна адсочваюць сітуацыю, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, вядома, знаходзяцца на асаблівым кантролі. У рамках гэтай работы, каб не прапусціць праблемныя моманты, якія ўзнікаюць, мы прадугледзелі штомесячны маніторынг умоў пражывання, — расказала Кацярына Каляда.

Яшчэ адна катэгорыя мер падтрымкі ветэранаў — дзяржаўныя сацыяльныя льготы. Яны прадугледжаны па розных кірунках: у сферы аховы здароўя, жыллёвай сферы, бясплатны праезд. Адной з важных мер падтрымкі з'яўляецца штогадовае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне. Летась гэтай паслугай скарысталася каля трох дзясяткаў ветэранаў.

— Улічваючы, што нашым ветэранам ужо амаль сто гадоў і па стане здароўя далёка не кожны можа скарыстацца такой мерай падтрымкі, для інвалідаў і ўдзельнікаў вайны прадугледжана грашовая дапамога на аздараўленне, гэта значыць, тым, хто не скарыстаўся санаторна-курортным лячэннем, аказваецца матэрыяльная дапамога ў памеры 10 базавых велічынь. У мінулым годзе такую грашовую дапамогу атрымалі амаль 550 чалавек на суму больш як 200 тысяч рублёў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Партнёрства

# У МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ

## 11 красавіка на ВДНГ у Маскве адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дням Магілёўскай вобласці

**Тое, што патэнцыял Прыдняпроўскага краю вялікі, наведвальнікі павільёна Рэспублікі Беларусь на ВДНГ у Маскве ўжо змаглі пераканацца. Магілёўская вобласць гаспадарыць на выстаўцы з 29 сакавіка. Тут ёсць чым уразіцца і захапіцца. Прыдняпроўскі край вядомы сваімі буйнымі прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, багатай культурна-гістарычнай спадчынай, унікальнай прыродай.**

Адной з яркіх візітовак вобласці з'яўляецца купальскае свята «Александрыя збірае сяброў», на якім вельмі ярка прадстаўлена ўся палітра сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця не толькі рэгіёна, але і краіны. Найлепшыя ўзоры машынабудавання, лёгкай прамысловасці, грамадскага харчавання, скарбы народнай спадчыны, дасягненні ў мастацтве — усё гэта складнікі вялікага рэспубліканскага купальскага свята. Не дзіўна, што адны з яго персанажаў — кум і кума ў народных строях — стануць падчас урачыстых мерапрыемстваў праваднікамі высокіх гасцей па выстаўцы вобласці.

У наведвальнікаў будзе магчымасць паспрабаваць лепшыя ўзоры прадукцыі Магілёўскага мясакамбіната, малочнага холдынга «Бабушкіна крынка», хлебабулачныя вырабы прадпрыемства «Дамачай». У стацыянарных крамах выставачнага павільёна шырока прадстаўлены асартымент вядучых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці: «Магатэкс», «Стужка», «Славянка», «Бабруйсктрыкатаж». Узоры свайёй прадукцыі прадэманструюць буйны вытворца ліфтавага абсталявання ААТ «Магілёўліфтмаш», прадпрыемствы машынабудаўнічай галіны ААТ «Белшына», «Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў» і іншыя.

Магілёўшчына — гэта яшчэ і «Край жыватворных крыніц». Пад такім брэндам прадстаўлены багаты прыродны і турыстычны патэнцыял вобласці. Сапраўдная жамчужына рэгіёна — Жыліцкі палацава-паркавы ансамбль, які быў адноўлены, дзякуючы рэспубліканскай праграме. На ролах можна ўбачыць, якія багатыя яго інтэр'еры і ўбранне залаў. Пра сялянскі быт Магілёўшчыны расказваюць упрыгожаная ўзорамі ткацтва, вышыўкі і іншых вырабаў народнага ўжытку «беларуская хатка». Нельга не захапіцца саматканымі дыванамі і ручнікамі таленавітых майстрых Прыдняпроўя.

З Магілёвам звязана шмат вялікіх гістарычных падзей. Адна з іх датычыцца Першай сусветнай вайны, калі на два гады вышэйшае ваеннае кіраўніцтва Расійскай арміі пераехала ў прыфрантавы губернскі горад. Перанесціся ў перыяд пачатку XX стагоддзя дапаможа выстаўка «Царская стаўка ў Магілёве».

Магілёўшчына беражліва адносіцца да захавання памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны. І адно з галоўных воінскіх месцаў славы — гэта Буйніцкае поле пад Магілёвам, дзе на 23 дні быў затрыманы наступ ворага. Летась на міжнароднай канферэнцыі «Гэта трэба — не мёртвым! Гэта трэба — жывым», якая праходзіла ў Магілёве, саюзы пісьменнікаў Беларусі і Расіі выступілі з ініцыятывай заснавання літаратурнай прэміі «Буйніцкае поле». Старшыні пісьменніцкіх арганізацый дзвюх краін выказалі меркаванне, што прэмія стане добрым стымулам для падтрымкі сучаснага літаратурнага працэсу ў Саюзнай дзяржаве і заахвочвання таленавітых аўтараў. Сузаснавальнікам прэміі выступіў таксама Магілёўскі аблвыканкам.

У рамках урачыстых мерапрыемстваў Дзён Магілёўскай вобласці адбудзецца прэзентацыя Міжнароднага маладзёжнага патрыятычнага праекта «Дарогамі Памяці і Славы». Яго арганізатарам выступае Магілёўскі абкам БРСМ пры асабістай падтрымцы старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі. Асноўная задача праекта — захаванне гістарычнай памяці, яднанне моладзі дзеля будучыні, міру і стварэння. У яго рамках адбываюцца адкрытыя дыялогі, закладванні паркаў і сквераў Памяці і Славы, ускладаюцца кветкі да воінскіх мемарыялаў, ладзяцца сустрэчы і канцэрты. Летась праект праводзіўся ў другі раз, яго ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі маладзёжных арганізацый з Ленінградскай, Смаленскай, Бранскай, Астраханскай абласцей і Хабараўскага краю Расіі.

Плённа развіваецца супрацоўніцтва Магілёўшчыны з расійскімі рэгіёнамі. Толькі за 2020—2023 гады суб'ектамі Магілёўскай вобласці ў рэгіёны Расійскай Федэрацыі накіравана інвестыцый на агульную суму 47 мільярдаў расійскіх рублёў — каля 90 % усіх інвестыцый вобласці за мяжу за гэты перыяд. З 2020 года з удзелам расійскага капіталу на тэрыторыі Магілёўскай вобласці рэалізавана восем праектаў у сферах машынабудавання, хімічнай прамысловасці, адукацыі, сельскай гаспадаркі і перапрацоўкі сельгаспрадукцыі. На іх рэалізацыю накіравана больш за 11 мільярдаў расійскіх рублёў, створана каля 730 працоўных месцаў. Патэнцыял вялікі, і абодва бакі шукаюць новыя шляхі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. 11 красавіка запланавана падпісанне двухбаковых дакументаў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным, культурным і прымежным супрацоўніцтве на 2024—2026 гады паміж Магілёўскім аблвыканкамам і адміністрацыяй Бранскай вобласці, а таксама аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве паміж Магілёўскай і Курскай абласцямі. Магілёўскі абкам БРСМ намераны падпісаць Пагадненні аб супрацоўніцтве з раённымі арганізацыямі Расійскага саюза моладзі Калужскай, Курскай, Тульскай, Мардоўскай абласцей, а таксама Масквы.

Удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных Дням Магілёўскай вобласці ў беларускім павільёне на ВДНГ, возьмуць Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Крутой, іншыя высокія госці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Тайланд прапанаваў аналаг шэнгена для шасці краін Паўднёва-Усходняй Азіі



Тайланд прапанаваў запусціць сумесную візу для сябе і яшчэ пяці краін Паўднёва-Усходняй Азіі (Камбоджы, Лаоса, Малайзіі, М'янмы і В'етнама), каб развіваць комплексны турызм з наведваннем некалькіх дзяржаў у рамках аднаго падарожжа. Аб гэтым паведаміла газета VN Express. Як адзначае выданне, ініцыятыва паступіла ад прэм'ер-міністра Тайланда Сетхі Тхавісіна, і яго калегі з іншых краін пазітыўна паставіліся да прапановы. У сваю чаргу, былы прэзідэнт Асацыяцыі атэляў Тайланда Марыса Сукасол лічыць, што для ўвядзення такой візы неабходна павялічыць тэрмін знаходжання з цяперашніх 30 дзён да 90, каб зрабіць прывабным падарожжа. Як паведаміла VN Express, летась шэсць краін Паўднёва-Усходняй Азіі прынялі ў агульнай складанасці 70 мільёнаў замежных турыстаў. Найбольшая колькасць, што адмовілася ад віз для турыстаў з Кітая і Індыі, адпачыла ў Тайландзе і Малайзіі.

### Еўрапол выявіў больш чым 820 злачынных груповак




Еўрапейскае паліцэйскае агенцтва (Еўрапол) выявіла 821 злачынную арганізацыю, якія пагражаюць Еўрасаюзу. У іх уваходзіць 25 тысяч чалавек 112 розных нацыянальнасцяў. Прыкладна палова з іх звязана з наркагандлем. Аб гэтым паведаміла агенцтва ТАСС. Даклад, які ахоплівае ўсе сферы незаконнай дзейнасці, быў зроблены ўпершыню. Паводле яго даных, 86 працэнтаў асноўных злачынных суполак удзельнічае ў легальным бізнесе, адмываючы такім чынам даходы, паведаміў Euronews. Злачынныя суполкі пранікаюць у легальны бізнес на тэрыторыі Еўрасаюза з дапамогай карупцыі. Інфармацыя, атрыманая ад усіх краін Еўрапола, дала магчымасць скласці карту і прааналізаваць дзейнасці злачынцаў на еўрапейскім узроўні.

### Брытанскі марафонец прабег праз усю Афрыку



Рас Кук, 27-гадовы жыхар Вялікабрытаніі, які захапляецца экстрэмальнымі відамі марафону, стаў першым у свеце чалавекам, які прабег праз увесь Афрыканскі кантынент. Падарожжа заняло 352 дні, а адлегласць, якую ён пераадолеў, перавысіла 16 тысяч кіламетраў. Пра гэта паведаміла Associated Press. Небяспечны для жыцця тур англійскі спартсмен пачаў 22 красавіка мінулага года ў ПАР з самага паўднёвага пункта Афрыкі — пасёлка Л'Агульяс, размешчанага на мысе Агульяс (Ігольны), а фінішаваў у Тунісе. Ён перасёк джунглі і пустыню, аб'ехаў зоны баявых дзеянняў, атрымаў мноства траўмаў, а таксама вырашаў праблемы з візамі. Першапачаткова ён планаваў справіцца за 240 дзён, аднак рабаванне яго і каманды ў Анголе, дзе былі скрадзены абсталяванне і пашпарты, а таксама сур'ёзныя болі ў спіне змянілі планы. Як адзначыў падарожнік, ён наведаў 16 краін і вельмі стаміўся. Раней ён ужо пераадольваў 3 тысячы кіламетраў ад Стамбула да Уортынга за 68 дзён.